**Алена Беразоўская**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# САЦЫЯЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ ДЗІЦЯЧАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ

У савецкі час дзіцячае тэлебачанне было элементам цэласнай адукацыйна-выхаваўчай сістэмы, дзе кожны элемент сістэмы «працаваў» на адзіную мэту – выхаванне маладых савецкіх грамадзян. Сёння гэтыя сістэмныя сувязі парушаны, і ёсць адчуванне, што дзіцячае тэлебачанне існуе ўвогуле асобна ад грамадства і яго сацыяльных інстытутаў.

Пытанні развіцця дзіцячага тэлебачання можна разглядаць у двух аспектах. Па-першае, гэта ўвогуле наяўнасць дзіцячага вяшчання на тэлеэкранах. А па-другое, адказнасць за змест тых праграм, якія прапануюцца дзецям.

Сённяшні тэлеэфір агульнанацыянальных каналаў не надта «багаты» на праграмы для дзяцей; ёсць каналы, на якіх ўвогуле няма дзіцячага вяшчання! Так, напрыклад, Першы канал (ОРТ) не мог дазволіць сабе такую «раскошу», як 15 хвілін прайм-тайма для праграмы «Спокойной ночи, малыши» (забаронена трансляцыя рэкламы падчас дзіцячых праграм), паступова хранаметраж скарачаўся на адну-дзве хвіліны, і сёння гэта – 9 хвілін (дзве з іх – арыгінальная застаўка) і «прапіска» на дзяржаўным канале «Расія». Айчыннае тэлебачанне прапануе маленькім гледачам штодзённа, акрамя выхадных, «Калыханку» («ЛАД»,) вячэрнюю казку «Добрый вечер, малыш» (СТБ), а таксама адзін раз на тыдзень спартыўна-забаўляльную праграму «Вас вызывает Спортландия» («ЛАД») і дзіцячы тэлечасопіс «Не зевай! » («ЛАД»). Вядома, задаволіць патрэбы і інтарэсы дзіцячай аўдыторыі такой колькасцю праграм немагчыма, паколькі нават без дэталёвага аналізу зразумела, што названыя праграмы, па-першае, вельмі абмежаваны ўзроставымі рамкамі (маецца на ўвазе, што ўлічаны не ўсе ўзроставыя групы). А па-другое, навідавоку пралікі праграмавання: час выхаду ў эфір праграм для дзяцей не ўзгоднены з агульнаадукацыйнай працэсам, і ўзнікае сітуацыя, калі падчас эфіру перадачы яе патэнцыяльныя гледачы яшчэ ў школе!

Існуе шмат даследаванняў айчынных і замежных навукоўцаў, часам супрацьлеглых, на прадмет карыснасці тэлебачання ў жыцці дзіцяці. І, вядома, што гэта непасрэдна звязана са зместам праграм, іх сэнсавым напаўненнем. Успомнім знакамітых «Тэлепузікаў»: самаму старэйшаму было чатыры гады, малодшаму – адзін, пры гэтым ніякай розніцы ў іх паводзінах не назіралася. У тэлепузікаў не было і галоўнага, найважнейшага атрыбуту дзяцінства – бацькоў! Закадравы голас сімвалізаваў дарослага ўвогуле, але яго роля была абмежавана толькі каментарыямі таго, што адбываецца на экране, і заўвагамі тыпу «пара спаць». Акрамя таго, аказалася, што тэлепузікі былі і разнаполымі, але ніякіх распазнавальных рысаў заўважыць не давялося. Тэлевізійнае, умоўнае скажэнне мадэлі існавання дзяцей і дарослых непасрэдным чынам уплывае на фарміраванне і функцыянаванне гэтай мадэлі ў рэальным жыцці, і няма гарантыі, што гэта мадэль не стане звычайнай праекцыяй убачанага на існуючае. Менавіта таму адказнасць за змест дзіцячых праграм найвялікшая. Лічыцца, што для дзяцей трэба здымаць як для дарослых, – толькі лепш.

На жаль, сёння нявыхаванасць, а часам і пошласць, пранікае на дзіцячыя тэлеэкраны. Калі раптам маленькі хлопчык заспявае: «Хочешь, хочешь, я знаю хочешь, но молчишь» – ці дзіцячая пара пачынае танцаваць вальс-бастон, то прыходзіш да высновы, што ёсць тэлебачанне «дарослае», ёсць «дзіцячае», а ёсць фальшывае…

Наспела неабходнасць пошуку новага тэледыялогу з дзіцячай аўдыторый, цікавага і пазнавальнага, суадноснага з патрэбамі сучасных дзяцей.